Смерць нямецкім акупантам!

Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 21 (752) | Серада, 12 красавіка | 1944 г.

ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

**Партызаны і партызанкі! Шырэй разгорнем барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі, дастойна сустрэнем міжнародны дзень 1-е мая! Азнаменуем яго новымі ўдарамі па тылах ворага!**

## Дастойна сустрэнем дзень 1-е мая

### ЗВАРОТ ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК АТРАДА ІМЯ Ч. ДА ЎСІХ ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК РАЁНА

У дні масавага выгнання нямецка-фашысцкіх акупантаў з нашай зямлі сустракаюць народы Савецкага Саюза міжнародны дзень 1-е мая. Па ўсяму фронту, ад Балтыйскага да Чорнага мора нямецкая армія пад ударамі нашых войск адкатваецца на захад, усцілаючы дарогі ваеннай тэхнікай і трупамі сваіх салдат і афіцэраў.

Нашы войскі завяршаюць вызваленне ад немцаў Украінскай і Малдаўскай ССР, Ленінградскай і Калінінскай абласцей, ідзе масавае выгнанне акупантаў з Беларусі. Пачалося вызваленне Прыбалтыйскіх рэспублік.

Чырвоная Армія дасягнула граніц Румыніі і Чэхаславакіі, падыходзіць да граніц Германіі і Венгрыі. Воіны Чырвонай Арміі фарсіравалі шырокім фронтам раку Прут і, развіваючы паспяховае наступленне, дасягнулі ракі Серэт і занялі некалькі гарадоў на румынскай тэрыторыі.

У дні масавага выгнання немцаў з нашай зямлі, у дні падрыхтоўкі да міжнароднага свята 1-е мая мы, партызаны і партызанкі атрада імя Ч. звярачваемся да ўсіх партызан і партызанак раёна з заклікам—азнаменаваць вялікае свята новымі магутнымі ўдарамі па тылах ворага, павышэннем баявой актыўнасці, павялічэннем сваіх баявых рахункаў.

Вядучы бязлітасную барацьбу з гітлераўскімі нягоднікамі, мы днём і ноччу не даём спакою ворагу. Мы за 7 месяцаў барацьбы маем на сваім баявым рахунку 7 спушчаных пад адкос эшалонаў праціўніка, 40 узарваных аўтамашын, 691 забітага і параненага гітлераўца, парваных 63 км. сувязі ворага, 9 узарваных мастоў.

Поспехі нашы ў барацьбе з акупантамі немалыя, але мы на іх не супакоімся. Пакуль вораг не разгромлен, будзем узмацняць удары па ім.

ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ! Мы абавязуемся і заклікаем вас усямерна дапамагаць наступаючай Чырвонай Арміі, узмацніць удары па тылах ворага, шляхах зносін, воінскіх складах, штабах, разрушаць лініі сувязі і камунікацыі праціўніка, лішаць яго магчымасці падцягваць рэзервы да лініі фронта. Дзейнічаць хутка і рашуча. Дапамагаць насельніцтву ўхіляцца ад нямецкай „мабілізацыі“. Раз'ясняць усім, што аб'яўленая немцамі „мабілізацыя“—новы крывавы план фізычнага знішчэння беларускага народа. Абараняць наш народ усімі сіламі і сродкамі ад угона ў нямецкае рабства. Знішчаць каманды, зганяючыя народ на зборныя пункты. Арганізоўваць народ на ўзмацненне ўсенароднай партызанскай барацьбы з нямецкімі захопнікамі.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Час нашай перамогі зараз блізак як ніколі. Усе сілы і сродкі на дапамогу фронту! Усё для хутчэйшай перамогі!

Няхай жыве гераічная Чырвоная Армія!

Няхай жыве правадыр і арганізатар вялікіх перамог таварыш СТАЛІН!

Смерць нямецкім акупантам!

(Прынята на агульным сходзе партызан і партызанак атрада імя Ч.).

## З аператыўных зводак Совінформбюро

### (З 5-га ПА 11 КРАСАВІКА)

Нашы войскі працягвалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка ў раёне захадней СКАЛА.

Войскі 1-га Украінскага фронта, нанёсшы паражэнне праціўніку ў прадгор'ях Карпат, вышлі на нашу Дзяржаўную граніцу з Чэхаславакіяй і Румыніяй па фронту 200 км. і занялі 7 раённых цэнтраў Станіслаўскай і Чэрнавіцкай абласцей, 300 насялёных пунктаў і 8 чыгуначных станцый. Войскі фронта занялі на румынскай тэрыторыі г. Серэт і 30 насялёных пунктаў.

Войскі 2-га Украінскага фронта фарсіравалі раку Прут паўночней г. Яссы па фронту 170 км. і, праследуючы праціўніка, вышлі да ракі Серэт, фарсіравалі яе, занялі на румынскай тэрыторыі 10 гарадоў, 530 насялёных пунктаў і 25 чыгуначных станцый.

На Кішэнёўскім напрамку нашы войскі занялі ўездны горад Малдаўскай С С Р ОРГЕЕЎ і райцэнтр Сусляны.

Войскі 3-га Украінскага фронта акружылі і знішчылі рэшткі 6 нямецкіх дывізій і авалодалі абласным цэнтрам Украіны ОДЭСА, г. Раздзельная, 5 райцэнтрамі, 350 насялёнымі пунктамі.

На днях войскі 4-га Украінскага фронта перайшлі ў наступленне па Перакопскім перашыйку, занялі г. Армянск і 30 насялёных пунктаў.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў і баі мясцовага значэння.

За 6 дзён баёў падбіта і знішчана 412 нямецкіх танкаў. Збіта 324 самалёт[illegible] праціўніка.

## КОЛЬКІ ТЫ ЗАБІЎ НЕМЦАЎ?

### Гарыць помста ў маім сэрцы

Знаходзячыся ў партызанскім атрадзе каля 2-х год я бязлітасна помшчу нямецкім людаедам за здзекі, учыняемыя імі над нашым народам.

Мой баявы рахунак бесперапынна папаўняецца. Я ўдзельнік спуска пад адкос варожага эшалона, узрыва на шасе Слуцк—Мінск 2-х аўтамашын, разгрома 4-х нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў. З партызанам тав. Г. злавіў 2-х гітлераўцаў і даставіў у атрад. Мною былі злоўлены са зброяй і дастаўлены ў атрад два паліцэйскія.

З групай партызан я сабраў і здаў энскаму партызанскаму атраду 2 станкавыя і 6 ручных кулямётаў, мінамёт, звыш 20 вінтовак, 25.000 патронаў.

Прабраўшыся ў нямецкі гарнізон, размешчаны ў населеным пункце Т., я застрэліў на пасту паліцэйскага і забраў яго зброю.

За час партызанскай дзейнасці я 15 разоў удзельнічаў у баях з гітлераўцамі і маю на сваім рахунку да 20 забітых немцаў і бобікаў.

Помста гарыць у маім сэрцы. Я буду знішчаць акупантаў да поўнага выгнання іх з нашай зямлі і канчатковага знішчэння іх.

АЛЕКСАНДР Б.,
атрад імя Ч.

### Помшчу за кроў народа

Больш 33-х месяцаў лютуюць фашысты на нашай беларускай зямлі, рабуюць гарады і сёлы, здзекваюцца з беларускага народа, вынішчаюць яго.

Усе часова акупіраваныя немцамі абласці Беларусі заліты кроўю і слязмі нашага народа.

Здзекі нямецкіх захопнікаў, кроў бацькоў, братоў і сясцёр выклікалі ў мяне, таксама, як і ў другіх патрыётаў Радзімы, жаданне да помсты. І я ўшоў у партызанскі атрад.

Будучы ў партызанскім атрадзе, са зброяй у руках б'ю гітлераўскіх выгоднікаў. Пры разгроме нямецкага гарнізона ў населеным пункце Л. я асабіста, ва ўпор, з вінтоўкі забіў немца. Пад маім кіраўніцтвам на мінах узарвана 2 нямецкія аўтамашыны і павозка, забіт 21 гітлеравец. У баю ў раёне Старая Смалярня—Адамова, дзе забіта многа немцаў і паліцэйскіх, я паліваў гітлераўцаў градам куль з ручнога кулямёта.

Я помшчу немцам за іх варварствы, за кроў і слёзы нашых матак, дзяцей, старыкоў і старух. І гэтая помста не згасне датуль, пакуль хоць адзін немец будзе на нашай зямлі.

М. САПЛЯКОЎ,
атрад імені Ф.

### Б'ю немцаў з „максіма"

У верасні мінулага года камандаванне партызанскага атрада імя Ч. назначыла мяне першым нумарам станкавага кулямёта. Гэта стала любімай маёй прафесіяй. Я здружыўся з „максімам". Ён моцная зброя ў барацьбе з нямецкімі акупантамі.

Два разы з „максімам" і са сваім другім нумарам Аляксандрам Р. я ўдзельнічаў у баях з нямецкімі карнікамі, дзе было забіта і паранена 26 гітлераўцаў.

Я б'ю немцаў не толькі з „максіма", а і з'яўляюся ўдзельнікам падрыва 7 нямецкіх аўтамашын на шасейнай дарозе Мінск—Слуцк, пад абломкамі якіх немцы аставілі 64 трупы сваіх салдат і афіцэраў. З партызанскімі групамі парэзаў 3.000 метраў сувязі ворага.

П. ШЭЎЛЯКОЎ.

### Следуйце нашаму прыкладу

Многа цяжкасцей перажылі мы, папаўшы ў нямецкі палон. Многія нашы таварышы памерлі ад голаду і холаду. Не меншыя здзекі прышлося перажыць, калі немцы гвалтоўна ператварылі нас дабравольцамі іхняй грабежніцкай арміі.

Гора было неапісальнае. Усюды нас сустракала дубінка і рэзінавы кнут. Нямецкія афіцэры пад зброяй гналі „дабравольцаў" знішчаць нашых людзей, паліць вёскі.

Гебельсаўскія брахуны ўвесь час запужвалі нас, што той хто служыць дабравольцам нямецкай арміі, папаўшы ў партызанскі атрад, расстрэльваецца партызанамі.

Зараз мы пераканаліся ў нямецкай брахні. Не так даўно наш узвод у колькасці 14 чалавек з усёй зброяй перайшоў да партызан. Цёпла сустрэлі нас партызаны. Мы зараз, разам са старымі партызанамі, помсцім нямецкім акупантам за іх зверствы над нашым народам, выганяем немчуру з нашай роднай зямлі.

Мы заклікаем усіх тых, хто выпадкова папаў на службу да немца, забіваць немцаў і са зброяй пераходзіць да партызан, следаваць нашаму прыкладу, уключацца ва ўсенародную партызанскую барацьбу.

Кузняцоў В. П., Патапаў, Пячэрыца, Ісакаў, Тлюстангелаў, Панжайлаў, Паронін, Факін, Нікалаеў, Смецюхоў, Зінчанка. Атрад ім. Р.

### За граніцай

Вялікія злучэнні англа-амерыканскай авіяцыі зрабілі налёт на ваенныя аб'екты ў г. Бухарэсце.

Гэта быў першы вялікі налёт на румынскую сталіцу.

*** 5-га красавіка авіяцыя саюзнікаў падвергла бамбардыроўцы нафтавыя промыслы ў раёне Плаешці (Румынія).

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б — Друкарня газеты „Сталінец".